Таким образом, в электронной библиотеке НББ заложены концептуальные и практические основы для сохранения электронных документов и организации доступа к ним по локальным и глобальным сетям через информационно-поисковые системы библиотеки.

*Доўнар Л.І. (Мінск)*

## АД «ДРАБНІЦ ЕЛЬСКІЯНЫ» ДА ПРАЕКТА ЭЛЕКТРОННАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ «БІБЛІЯТЭКІ І МУЗЕЯ СТАРАЖЫТНАСЦЕЙ АЛЯКСАНДРА ЕЛЬСКАГА»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння імя Аляксандра Ельскага, дзякуючы нястомнай працы, у першую чаргу, нашых літаратуразнаўцаў Адама Мальдзіса, Генадзя Кісялёва, Уладзіміра Мархеля, Уладзіміра Казберука, Кастуся Цвіркі і іншых, вернута з забыцця. Пераасэнсавана і вызначана яго ўплывовая роля гісторыі развіцця беларускай літаратуры і культуры.

У 1999 г. да 165-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Ельскага ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў (БДУКМ) быў арганізаваны комплекс мерапрыемстваў: міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Універсітэты Ельскіх», выданне і прэзентацыя зборніка навуковых артыкулаў «Дзеля блізкіх і прышласці», канцэртнае выкананне музычных твораў Ельскіх, узноўлена месца пахавання Ельскіх, зроблены помнік А. Ельскаму. На канферэнцыі прысутнічалі нашчадкі Ельскіх з Францыі, Польшчы, Украіны. Мерапрыемствы адначасова сталі і пачаткам, і працягам навуковага даследавання не толькі знакамітага на Беларусі і Польшчы роду, але і амаль не распрацаванага пласта сядзібнай культуры, якая паўстае своеасаблівым феноменам у гісторыка-культурным развіцці беларускага грамадства.

«Універсітэты Ельскіх» мелі шырокі рэзананс як у навуковым свеце, так і ў прэсе. Так, напрыклад, газета «Культура» пісала, што «пакладзены пачатак новай традыцыі» (Культура, 1999, 9–15 кастр., с. 5), «канферэнцыя, прысвечаная жыццю і творчасці Аляксандра Ельскага, – не шараговая з'ява для нашага культурнага і навуковага жыцця» (Культура, 1999, 6–12 лістап., с. 12), бо, відаць, «прыйшоў нарэшце час збіраць камяні» (Белорусская деловая газета, 1999, 11 окт., с. 20).

Асноўны акцэнт канферэнцыі быў зроблены на вылучэнні кніжнай культуры Беларусі як адной з важнейшых складаючых сядзібнай культуры. Быў падрыхтаваны электронна-графічны каталог рэшткаў кнігазбору А. Ельскага ў Беларусі «Драбніцы Ельскіяны», што актуалізавала праблему вывучэння прыватных кнігазбораў Беларусі, якія застаюцца слаба распрацаванымі. Тым не менш такія калекцыі фарміруюць грамадскую і гістарычную спадчыну першачарговага парадку, што робіць магчымым перадачу будучым пакаленням слядоў дзейнасці пэўных асоб, і тым самым з'яўляюцца важкім інструментам у справе захавання калектыўнай памяці.

Ушанаванне спадчыны Ельскіх у Беларусі паспрыяла таму, што ў 2007 г. на Украіне (Данецк) адным з нашчадкаў роду Віктарам Мікалаевічам Ельскім пры падтрымцы Сената Рэспублікі Польшча была праведзена навуковая канферэнцыя, прысвечаная 500-годдзю знакамітай еўрапейскай дынастыі. Выйшаў зборнік «Ельскія ўчора і сёння» (Данецк, 2007) на ўкраінскай, польскай і беларускай мовах. Ад Беларусі былі прадстаўлены тры даклады: А. Мальдзіса аб ролі Аляксандра Ельскага ў культуры Беларусі «З пячаткай Аляксандра Ельскага», Л. Доўнар «Спадчына Ельскіх і Беларусь. Да 170-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Ельскага» і А. і Н. Федарукоў «Ельские: землевладения и архитектурно-историческое наследие», у якіх закраналіся пытанні захавання культурна-гістарычнай спадчыны роду ў Беларусі, што ў сваю чаргу заслугоўвае таго, каб пра яе паклапацілася дзяржава і ўзяла пад сваю апеку. Нягледзячы на страты, сёння такая магчымасць яшчэ застаецца (і ў Дудзічах, і ў Калініне – Ігнацічах, і ў Замосці), а ва ўзаемадзеянні і пры міжнароднай падтрымцы – гэта ганаровая і пачэсная справа.

Вяртаючыся да пытання кніжнай і музейнай калекцыі А. Ельскага, трэба сказаць, што ў шматлікіх працах даследчыкаў (ды і самога А. Ельскага) не абыходзілася, каб у іх не закранался пытанне замосцінскіх збораў, якія вызначаліся багаццем матэрыялаў пра Беларусь і асабліва Міншчыну. Як адзначаў А. Ельскі ў 1890 г., «любай Міншчыне» ён аддаў звыш трыццаці год шчырай працы, каб грунтоўна яе пазнаць: «Гэта ж ва ўсіх адносінах калыска нашай нацыянальнай справы» [2, с. 435]. Варта таксама хоць бы заўважыць, што пры напісанні сваіх прац, прысвечаных, напрыклад, Радзівілам (Слуцкія паясы, урэчскае шкло, Нясвіж і інш.), А. Ельскі грунтаваўся і карыстаўся арыгіналамі або копіямі рукапісных і друкаваных дакументаў, твораў мастацтва і матэрыяльнай культуры са сваёй дзесяцітысячнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калекцыі. Дакументальныя і матэрыяльныя аб'екты, ашчадна сабіраныя А. Ельскім, які разумеў іх неацэннае значэнне, не адзін раз паслужылі і, спадзяёмся, паслужаць для новых адкрыццяў, як сталася ў руплівай працы А. Мальдзіса, В. Рагойшы, У. Казберука, што вярнулі ў літаратуру невядомыя беларускія творы, выяўленыя ў зборах А. Ельскага [6, с. 78, 335].

Аб глыбокім даследаванні спадчыны А. Ельскага ў разнастайных яе аспектах гаварылася многімі беларускімі вучонымі, ды крок за крокам і рабілася. Цалкам у якасці праграмных кірункаў можам вызначыць наступныя:

– **поўнае бібліяграфаванне прац А. Ельскага**. «Аб важнасці для беларускай культуры такой бібліяграфіі» пісаў яшчэ Рамуальд Зямкевіч у 1919–1920-х гг. [6, с. 338; 11, 30]. Першая спроба бібліяграфавання «размаітай спадчыны, раскіданай па шматлікіх газетах, часопісах, зборніках», была выканана Г. Кісялёвым і змешчана ў другім томе біябібліяграфічнага слоўніка «Беларускія пісьменнікі» (Мн., 1993. Т. 2. С. 421–422) [8, с. 52]. Дзякуючы гэтай рабоце аказаліся зафіксаванымі 244 публікацыі А. Ельскага ў газетах, часопісах, зборніках, энцыклапедыях; 26 – назваў асобных аўтарскіх выданняў (у адным А. Ельскі – складальнік); тры пераклады – усе за 1860–1911 гг. Калі ўлічваць, што пісьменнікам былі напісаны тысячы артыкулаў, як ён сам пісаў, толькі для «Геаграфічнага слоўніка» – звыш 10 тысяч [2, с. 435; 12], то, відавочна, застаецца яшчэ вялікі аб'ём працы. Ужо сёння, напрыклад, спіс асобных выданняў А. Ельскага, складзены Г. Кісялёвым, можа быць дапоўнены яшчэ 8 назвамі: 7 з іх – прыжыццёвыя (гл. «Драбніцы Ельскіяны: матэрыялы да рэканструкцыі прыватнага кнігазбору А. Ельскага» ў выданні «Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры» (Мн., 2008. Вып. 2), і адно, выдадзенае на беларускай мове ў 1918 г., – Jelski, A. Uschodnjaja Belarus: statustyčnye i gistaryčnye materyjaly. – Mensk, 1918 (druk Ja.A. Grynbljata). – 13 s. – захоўваецца ў чатырох асобніках у Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве (I.1.764.001; I.1.384.857; 1993 W 211/6; 1993 W 211/5);

– **перавыданне ў перакладзе на беларускую мову тэкстаў публікацый і рукапісаў А. Ельскага** [6, с. 338], якія з'яўляюцца каштоўнейшымі гісторыка-культурнымі і краязнаўчымі крыніцамі. Першыя крокі ў азначаным кірунку былі зроблены ў выданні зборніка дакументаў і матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці беларускіх пісьменнікаў XIX ст. «Пачынальнікі» (1977) [11], а таксама ў другім выданні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хрэстаматыі беларускай літаратуры XIX ст. У 2004 г. найбольш значныя і цікавыя працы, а таксама лісты А. Ельскага да Юзафа Крашэўскага і Яна Карловіча ў перакладзе на беларускую мову выйшлі ў «Выбраным» (выданне ажыццёўлена «Беларускім кнігазборам»);

**– узнаўленне гісторыі калекцыі**, якая мае для Беларусі надзвычай важнае агульнакультурнае значэнне. Вырашэнне гэтай задачы патрэбна, як пісаў Г. Кісялёў, і «для высвятлення лёсу нашых гісторыка-літаратурных матэрыялаў, краязнаўчай эўрыстыкі», якія неабходна ўвязаць з гісторыяй музейнай справы і калекцыяніравання, маючы на ўвазе кнігазборы XIX ст., у першыю чаргу, Аляксандра Ельскага, а таксама, да слова, Б. Эпімах-Шыпілы, Р. Зямкевіча, Беларускага музея ў Вільні [6, с. 382–383]. Пачынаючы з 1990 г., не кажучы пра інфармацыю ў каталогах бібліяфільскіх збораў [15], у друку з'явіліся і апісанні бібліятэкі і музея А. Ельскага, адшуканыя Г. Кісялёвым [4] і І. Марачкінай [3]. Праўда, уласна каталога калекцыі да гэтага часу не выяўлена, хаця тое, што ён існаваў, засведчыў і сам А. Ельскі, у прыватнасці, у лісце да Юзафа Крашэўскага ад 4 красавіка 1875 г., у якім ён пісаў: «[...] я атрымаў ад Вас абяцанне ахвяраваць мне для збору аўтографы [...]. Кожны кавалачак паперы, хоць самы маленькі, прыдасца мне для калекцыі, а ахвяраваную серыю гэтых памятак пазначу ў каталогу [...]» [2, с. 421]. Вядома таксама, што калекцыя аўтографаў была яе ўладальнікам «упарадкавана храналагічна» [2, с. 427]. Пошук асобнікаў «Ельскіяны» можа праводзіцца і па ўладальніцкіх правененцыйных адзнаках – пячатках: «Biblioteka i Muzeum Starożytności Aleksandra Jelskiego w Zamościu», «Aleksander Jelski Zamość przez Gub. m. Mińsk», «Z biblioteki i museum starożytności Aleksandra Jelskiego w Zamościu»; штампах і штэмпелях: «Zamość Poczta Uzlany gub. Mińska. Telegraf Rudzieńsk»; аўтографах Ельскага і Ельскаму [1; 12; 13]. У сувязі з гэтым вызначаюцца такія кірункі, як:

– **рэканструкцыя кнігазбору А. Ельскага**. Да першай міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай А. Ельскаму ў 1999 г., як ужо адзначалася, супрацоўнікамі аддзела рэдкіх кніг БДУКМ была зроблена спроба апісання тых асобнікаў кніг, якія захаваліся ў НББ і ЦНБ НАН Беларусі, створаны на гэтай аснове электронны ілюстраваны каталог «Драбніцы Ельскіяны» (уключае апісанні і ілюстрацыі 30 асобнікаў) [1]. У працяг – падрыхтаваны таксама бібліяграфічны спіс кніг А. Ельскага, выяўленых у тым ліку ў замежных фондах (уключае апісанні 204 асобнікаў), што можа паслу-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыць пэўнай асновай для далейшай рэканструкцыі яго кнігазбору [Дадат. 2];

– **улік і апісанне аб'ектаў музейнай калекцыі**: графікі, жывапісу, нумізматыкі, керамікі і іншых твораў мастацтва паводле іх сённяшняга месца захавання. Прапанова была выказана Л. Коўкель у 2004 г. у прыватнай перапісцы. Пра арганізацыю падобнай працы, стварэнне каталога экспанатаў пісаў і Я. Янушкевіч [14, с. 299, 300];

– **бібліяграфаванне публікацый пра А. Ельскага.** Пачаткам гэтай работы, якая стане крыніцазнаўчай асновай для навукова-пошукавых даследаванняў, можа таксама паслужыць бібліяграфічны спіс Г. Кісялёва ў «Беларускіх пісьменніках» (Т. 2. С. 422–423). На аснове разнастайнай фактаграфічнай інфармацыі пра Ельскіх, якая канцэнтравалася ў Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Ф. Скарыны, супрацоўнікамі аддзела рэдкіх кніг БДУКМ было распачата фарміраванне бібліяграфічнай базы даных пра Ельскіх;

– **вяртанне або поўнае капіраванне рукапіснай і друкаванай спадчыны**, у тым ліку эпісталярнай, нотаў, фотадакументаў [6, с. 115, 153, 383]. Прыкладаў вяртання набярэцца няшмат. Тым не менш яны былі – гэта фонд аўтографаў А. Ельскага ў БДАМЛіМ і пяць кніг А. Ельскага, падараваных ім Элізе Ажэшка, у канвалюце – у НББ [12], якія былі перададзены з Масквы. У аддзеле рэдкіх кніг БДУКМ захоўваецца алічбаваная калекцыя фотаздымкаў і некаторых рукапісаў, перададзеных нашчадкамі Ельскіх. Ці магчыма вяртанне, калі вядомая на сённяшні дзень калекцыя А. Ельскага была ім самім часткова ахвяравана ў Вільню і Кракаў або выкуплена ў сваякоў? Як сведчыць інвентарны вопіс Нацыянальнага музея ў Варшаве, «Zbiór z Muzeum Narodowego. Zespół i z lat 1495–1922». S. XV): «[…] w latach międzywojennych sprzedawali Jelscy-sukcesorzy rękopisy: Przezdzieckim, Muzeum Narodowemu i Bibliotece Narodowej. Rękopisy sprzedane do archiwum Przezdzieckich jak również te, które zakupiło Muzeum Narodowe, przetrwały». У асноўным, гэта рукапісныя зборы XV–XVIII стст., а таксама друкі, многія з якіх маюць, як пазначана, «zły stan zachowania». Таму, відаць, найбольш відавочны шлях вяртання – капіраванне, а, дакладней, – алічбоўка дакументаў, у якой павінны быць зацікаўлены ўсе бакі, хаця і першы шлях, як падаецца, можа таксама абмяркоўвацца (верагодней, у дачыненні да асобных выданняў А. Ельскага, якія адсутнічаюць у бібліятэках Беларусі і шматэкзэмплярна захаваны, напрыклад, у Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для таго, каб праца па адзначаных кірунках была цалкам рэалізавана, неабходна, на наш погляд, падыходзіць да яе комплексна, паэтапна і, зразумела, з уключэннем праекта ў дзяржаўную нацыянальную праграму, якой калісьці была «Спадчына», а сёння – «Памяць Беларусі», з абавязковай падтрымкай Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА Рэспублікі Беларусь у рамках праграмы ЮНЕСКА «Памяць свету». Акрамя таго, неабходна, каб гэта пытанне ўвайшло і ў кола зацікаўленняў, у першую чаргу, Беларуска-польскай кансультацыйнай камісіі па справах гісторыка-культурнай спадчыны, Камітэта па ахове кніжных помнікаў Беларусі ББА. Бібліятэка і музей старажытнасцей А. Ельскага маюць не меншую вартасць для беларускай культуры, чым «Радзівіліяна», у першую чаргу з таго пункту гледжання, што «Ельскіяна» фарміравалася як беларусазнаўчая калекцыя. Тым больш неабходна актуалізацыя ролі А. Ельскага ў галіне гісторыі кніжнай культуры Беларусі. Працы А. Ельскага і яго калекцыйныя зборы служаць грунтоўнай крыніцай у вывучэнні шэрага прыватных кнігазбораў і архіваў, у іх ліку Радзівілаў, Храптовічаў.

Даўно наспела для Беларусі такая задача, як вызначэнне тых асноўных гістарычных кнігазбораў, «вяртанне» якіх спрыяла б навуковай працы, папаўненню ўласных нацыянальных калекцый. Ад «Драбніц Ельскіяны» трэба рухацца да нацыянальнага праекта электроннай рэканструкцыі «Бібліятэкі і музея старажытнасцей Аляксандра Ельскага», які ў сваю чаргу павінен грунтавацца на міжведамасным ўзаемадзеянні і, зразумела, выходзіць на міжнародны ўзровень.

Наступнае, што неабходна зрабіць, – гэта стварыць творчую (рабочую) групу па распрацоўцы канцэпцыі праекта: ад навуковага яго аснашчэння да фінансавага забеспячэння. Думаю, неабходна прыцягнуць да вырашэння дадзенага пытання ў першую чаргу адпаведных спецыялістаў – літаратуразнаўцаў, мастацтвазнаўцаў, кнігазнаўцаў, бібліёграфаў, праграмістаў і г. д., якія маглі б аказваць кансультацыйную і кампетэнтную дапамогу ў арганізацыі эфектыўнай і дзейснай працы.

Адным з важнейшых аспектаў рэалізацыі праекта павінна стаць вызначэнне:

– крыніцазнаўчай базы даследавання;

– далейшых навуковых пошукаў і даследаванняў;

– асноўных этапаў бібліяграфавання і алічбоўкі разнастайных дакументаў;

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

– прынцыповых пытанняў шляхоў вяртання – ад фізічнага да электроннага;

– цэнтралізаванай канцэнтрацыі дакументаў, якія вяртаюцца.

У якасці дапаможных матэрыялаў на этапе распрацоўкі праекта электроннай рэканструкцыі «Бібліятэкі і музея старажытнасцей Аляксандра Ельскага» могуць паслужыць:

– спіс выяўленых перыядычных і шматтомных выданняў для аналітычнага бібліяграфавання прац А. Ельскага [Дадат. 1];

– спіс бібліятэк і іншых фондасховішчаў, дзе захоўваюцца рэшткі кнігазбору «Ельскіяны» [Дадат. 2];

– спіс архіваў і іншых фондасховішчаў, дзе выяўлены рукапісныя дакументы (лісты, аўтографы) і рэшткі музейнай калекцыі [Дадат. 3];

– спіс рарытэтаў для рэзервовых пошукаў паводле апісання калекцыйных збораў (магчыма, што ў выніку навуковых пошукаў з'явіцца магчымасць выявіць каталог бібліятэкі) [2; 7];

– спіс асоб, якія кантактавалі з А. Ельскім, яго сваякоў (напрыклад, паводле «Кнігі запісаў...») [9] і інш.

Такім чынам, мяркуемым вынікам комплекснага праекта могуць стаць бібліяграфічная база даных прац А. Ельскага і літаратуры пра яго, каталог кнігазбору (у працяг «Драбніц Ельскіяны»), паўнатэкставыя базы даных рукапіснай спадчыны «Ельскіяны» і ілюстраваны каталог мастацкіх і гісторыка-археалагічных калекцый, зафіксаваныя на CD-ROM, выстаўленыя на еўрапейскім партале «Культурная спадчына», а таксама апублікаваныя ў выглядзе бібліяграфічных і манаграфічных прац.

Мэтанакіраваная работа А. Ельскага – навуковая, культурная, літаратурная, гісторыка-краязнаўчая, публіцыстычная, кнігазнаўчая, – скіраваная дзеля Беларусі і беларусаў і запатрабаваная ў XIX – пач. XX ст., не страціла сваёй прыцягальнай сілы і актуальнасці і ў XXI ст. Толькі сёння ўжо ад нас будзе залежаць, ці здолеем мы ацаніць, раскрыць, вярнуць і ўсвядоміць назапашанае і створанае А. Ельскім. «Абавязак жывых заключаецца ў тым, каб спадчына продкаў не згінула дарэмна, але, дбайна дагледжаная, заставалася духоўным пажыткам для наступных пакаленняў!» – такімі словамі завяршаецца артыкул А. Ельскага «Гістарычныя звесткі пра фабрыку шкла і аздобных люстэрак у Радзівілаўскім Урэччы на Літве»[2, с. 106].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. **Доўнар, Л.** «Драбніцы Ельскіяны» ў сацыякультурнай прасторы (пра электронна-графічны каталог) / Ларыса Доўнар // Старажытны Тураў: Асвета Святыні : тэз., даклады навук.-асвет. канф. (4 вер. 2004 г., г. Тураў). – Мінск : Юніпак, 2004. – С. 46–49.

2. **Ельскі, А.** Выбранае / Аляксандр Ельскі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – С. 106, 421, 427, 436.

3. **Ельскі, У.** На зямлі продкаў. Успаміны пра дзядзьку Аляксандра Ельскага з Замосця / Уладзіслаў Ельскі ; прадм. і пер. з пол. І. Марачкінай // Шляхам гадоў : гісторыка-літ. зб. – Мінск : Маст. літ., 1993. – С. 140–148.

4. **Замосце**: скарбы Аляксандра Ельскага. Генрых Ельскі пра музей свайго дзеда / пер., публ., уступ. слова і пасляслоўе Г. Кісялёва // Шляхам гадоў: гісторыка-літ. зб. – Мінск : Маст. літ., 1990. – С. 296–304.

5. **Казбярук, У.** Энцыклапедыст з Замосця / Уладзімір Казбярук, Кастусь Цвірка // Ельскі, А. Выбранае. – Мінск : «Беларускі кнігазбор», 2004. – С. 5–16.

6. **Кісялёў, Г.В.** Ад Чачота да Багушэвіча: Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. / Г.В. Кісялёў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 397 с.

7. **Мальдзіс, А.** Таямніцы старажытных сховішчаў / Адам Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 1974. – 176 с.

8. **Марачкіна, І.** Руплівец з Замосця / Ірына Марачкіна // Дзеля блізкіх і прышласці : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння А. Ельскага). Мінск, 7 кастр. 1999 г. / [склад., прадм.: Л. Доўнар, Т. Дзем'яновіч]. – Мінск : Бел. ун-т культуры ; РВФ «Ковчег», 1999. – С. 50–71.

9. **Мархель, У.** «Кніга для запісу ...», або 234 аўтографы / Уладзімір Мархель // Дзеля блізкіх і прышласці : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння А. Ельскага) Мінск, 7 кастр. 1999 г. / [склад., прадм.: Л. Доўнар, Т. Дзем'яновіч]. – Мінск : Бел. ун-т культуры ; РВФ «Ковчег», 1999. – С. 5–26.

10. **Мархель, У.** Крыніцы памяці: Старонкі беларуска-польскага літ. сумежжа / Уладзімір Мархель. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 222 с.

11. **Пачынальнікі.** З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. / уклад. Г.В. Кісялёў ; рэд.: В.В. Барысенка, А.І. Мальдзіс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 544 с. : іл.

12. **Пугачова, С.** Невядомы зборнік А.К. Ельскага з асабістай бібліятэкі Э. Ажэшка ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі / Святлана Пугачова // Дзеля блізкіх і прышласці : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння А. Ельскага). Мінск, 7 кастр. 1999 г. / [склад., прадм.: Л. Доўнар, Т. Дзем'яновіч]. – Мінск : Бел. ун-т культуры ; РВФ «Ковчег», 1999. – С. 85–91.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. **Сільнова, Л.** Ельскі. Ельскага. Ельскаму... / Людміла Сільнова // Дзеля блізкіх і прышласці : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння А. Ельскага). Мінск, 7 кастр. 1999 г. / [склад., прадм.: Л. Доўнар, Т. Дзем'яновіч]. – Мінск : Бел. ун-т культуры ; РВФ «Ковчег», 1999. – С. 76–85.

14. **Янушкевіч, Я.** За архіўным парогам. Беларуская літаратура XIX – XX стагоддзяў у святле архіўных пошукаў / Язэп Янушкевіч. – Мінск : Маст. літ., 2002. – 381 с. : іл.

15. **Chwalewik, E.** Zbiory polskie. Archiwa, biblioteki, gabinety, galerie, muzea i inne zbiory pamiątek przeszłości w ojczyźnie i na obczyźnie w porządku alfabetycznym według miejscowości ułożone / Edward Chwalewik. – Warszawa, 1927. – T. 2. – S. 536; Paszkiewicz, U. Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej (spis za lata 1510–1939) / Urszula Paszkiewicz. – Warszawa, 1998. – S. 194.

Дадатак 1

## Спіс выяўленых перыядычных і шматтомных выданняў, дзе публікаваліся артыкулы А. Ельскага

| № п/п | Назва выдання | Вядомыя публікацыі | Крыніца інфармацыі |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | Biblioteka Warszawska (Варшава) | 1890. T. 1. | Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 421–422. |
| 2 | Bul. PAU | 1893 | Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 421–422. |
| 3 | Chwila (Варшава) | 1886. № 17–23. | Пачынальнікі. Мн., 1977. С. 30, 37. |
| 4 | Dziennik Wileński (Вільня) | 1906 | Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 421–422. |
| 5 | Gazeta Rolnicza (Варшава) | 1880 (№ 40–42, 50) | Ельскі, А. Выбранае. Мн., 2004. С. 292. |
| 6 | Gazeta Warszawska (Варшава) | 1880, 1886, 1890 | Шляхам гадоў. Мн., 1993. С. 145. |
| 7 | Kalendarz rzymsko-katolickiego Towarzystwa Dobroczynności przy Kościele Św. Katarzyny w | 1898, 1899, 1902, 1903 | Мархель, У. Крыніцы памяці. Мн., 1990. С. 140; Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 421–422. |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| | Petersburgu na rok zwyczajny … (С.-Петербург) | | |
| 8 | Kłosy (Варшава) | 1877 | Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 421–422. |
| 9 | Kraj (С.-Пецярбург) | 1882–1898, 1908. | Кісялёў, Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча. С. 132, 337; Ельскі, А. Выбранае. Мн., 2004. С. 230, 351; Дзеля блізкіх і прышласці. Мн., 1999. С. 12; Мархель, У. Крыніцы памяці. Мн., 1990. С. 138–141; Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 421–422. |
| 10 | Kurier Wieleński = Виленский Вестник (Вільня) | 1860–1862; 1884. № 52. | Кісялёў, Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча. С. 337; Бел. пісьменнікі. Т.2. С. 421–422. |
| 11 | Przegląd Literacki (дадатак да "Kraju") | 1886–1890,1888. № 6–7; 1889. № 2, 7, 14, 16. | Ельскі, А. Выбранае. С. 352, 354; Кісялёў, Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча. С. 336; Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 421–422. |
| 12 | Słownik geograficzny Królestwa Polskiego I innych krajów słowiańskich | 1883–1895 | Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 421-422. |
| 13 | Sprawozdania Komisyi do badania historyi sztuki w Polsce | 1896, 1899, 1900 | Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 421–422. |
| 14 | Tellus (Варшава) | 1887 (?) | Ельскі, А. Выбранае. Мн., 2004. С. 485. |
| 15 | Tygodnik Ilustrowany | 1885. Т. 6. № 152. | Дзеля блізкіх і прышласці. Мн., 1999. С. 23; Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 421–422. |
| 16 | Tygodnik Powszechny | 1880. № 9–13. | Ельскі, А. Выбранае. Мн., 2004. С. 223; Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 421–422. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| 17 | Tygodnik Wileński | 1911 | Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 421–422. |
| 18 | Wiek | | Шляхам гадоў. Мн., 1993. С. 145. |
| 19 | Wielka Encyklopedia Powszechna Ilustrowana | 1892–1903 | Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 421–422. |
| 20 | Wisła (Варшава) | 1899 | Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 421–422. |
| 21 | Витебские губернские ведомости (Віцебск) | 1896. № 84, 86, 87, 90. | Дзеля блізкіх і прышласці. Мн., 1999. С. 63. |

Дадатак 2

## Спіс бібліятэк і іншых фондасховішчаў, дзе захоўваюцца рэшткі «Ельскіяны» (друкаваныя выданні)*

| **Назва бібліятэк і фондасховішчаў** | **Месца захоўвання** | **Колькасць выяўленых асобнікаў** |
|---|---|---|
| Архіў галоўны актаў даўніх у Варшаве | III. Archiwum Prozorów i Jelskich | **29** |
| Бібліятэка Акадэміі навук Літвы | Аддзел рэдкіх кніг | **17** |
| Бібліятэка Акадэміі навук Украіны (Львоў) | | **4** |
| Бібліятэка Расійскай акадэміі навук | | **1** |

* Падрабязны бібліяграфічны спіс гл.: «Драбніцы Ельскіяны: матэрыялы да рэканструкцыі прыватнага кнігазбору А. Ельскага» / склад. Л.І. Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. Вып. 2 / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: Доўнар Л.І., Самайлюк Т.А., Т. Дзем'яновіч. – Мінск, 2008.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| (С.-Пецярбург) | | |
| Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей | Аддзел рэдкіх кніг і старадрукаў | 2 |
| Навуковая бібліятэка Вільнюскага універсітэта | | |
| Нацыянальная бібліятэка Беларусі | Аддзел беларускай літаратуры; Навукова-даследчы аддзел кнігазнаўства | 34 |
| Нацыянальная бібліятэка ў Варшаве | Фонды I, II, III; Фонд Красінскіх | 84 |
| Расійская дзяржаўная бібліятэка (Масква) | | 4 |
| Расійская нацыянальная бібліятэка (С.-Пецярбург) | Аддзел Pocікі | 6 |
| Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі | Аддзел рукапісаў і рэдкіх кніг | 19 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Д а д а т а к 3

## Спіс выяўленых архіваў і фондасховішчаў, дзе захоўваюцца рукапісы і рэшткі музейнай калекцыі А. Ельскага

| | | | |
|---|---|---|---|
| **АГУЛЬНЫЯ КРЫНІЦЫ ІНФАРМАЦЫІ** | | | |
| Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 423; Кісялёў, Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча. Мн., 1993. С. 78, 79, 114–118, 270–271, 335–338, 380–382; Шляхам гадоў. Мн., 1990. С. 301–304; Пачынальнікі. Мн., 1977. С. 506, 507–508, 515, 519, 522; Ельскі, А. Выбранае. Мн., 2004. | | | |
| **ПОЛЬШЧА** | | | |
| **Месца-знаходжанне** | **Архіў, бібліятэка** | **Фонды** | **Крыніца інфармацыі** |

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| **Варшава** | Нацыянальны музей | Рукапісныя зборы XV–XVIII стст., друкі, аўтографы | Zbiory rękopisów w bibliotekach i muzeach w Polsce / oprac. D. Kamołowa. Warszawa, 1988; Шляхам гадоў. Мн., 1990. С. 299, 300, 303. |
| **Варшава** | Бібліятэка Варшаўскага універсітэта | Рук. Ф. 429, 461 | Бел. пісьменнікі. Т. 2. Мн., 1993. С. 423. |
| **Варшава** | Архіў галоўны даўніх актаў | III. Ф. Прозараў і Ельскіх, спр. 140, ч. 1, 2; Збор Каратынскіх | Старонкі літаратурных сувязей. Мн., 1970. С. 161; Замежная архіўная беларусіка. Мн., 1998. С. 255–261; Ельскі. А. Выбранае. Мн., 2004. С. 6; Дзеля блізкіх і прышласці. Мн., 1999. С. 71–75; Бел. пісьменнікі. Т. 2. С. 423. |
| **Варшава** | Музей Войска Польскага ў Варшаве | | Zbiory rękopisów w bibliotekach i muzeach w Polsce / oprac. D. Kamołowa. Warszawa, 1988. |
| **Варшава** | Нацыянальная бібліятэка | Рук. 2674, 2760–2768, 5087 акц., 5995, 7351 | Zbiory rękopisów w bibliotekach i muzeach w Polsce / oprac. D. Kamołowa. Warszawa, 1988; Дзеля блізкіх і прышласці. Мн., 1999. С. 5, 89, 91; Бел.пісьменнікі. Т. 2. Мн., 1993. С. 423 |
| **Вілянова** | Віляноўскі музей | Сямейны партрэт Ельскіх (жывапіс, мастак Ф. Смуглевіч) | Мальдзіс, А. Гісторыя унікальных рэчаў // Беларусь. 1979. № 4. С. 17. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| **Вроцлаў** | Бібліятэка Асалінскіх (Асалінэум) | Рук. Ф. 6213/III, 7699/II, 8032/I | Старонкі літаратурных сувязей. Мн., 1970. С. 161; Мальдзіс, А. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974. С. 125; Бел. пісьменнікі. Т. 2. Мн., 1993. С. 423. |
| **Кракаў** | Бібліятэка ПАН | Рук. Ф. 4610 | Мальдзіс, А. Творчае пабрацімства. Мн., 1966. С. 149; Мальдзіс, А. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974. С. 101; Бел. пісьменнікі. Т. 2. Мн., 1993. С. 423. |
| **Кракаў** | Бібліятэка Ягелонскага універсітэта | Рук. Ф. 5993, 6508 IV, 9241 | Старонкі літаратурных сувязей. Мн., 1970. С. 161; Мальдзіс, А. Творчае пабрацімства. Мн., 1966. С. 149; Мальдзіс, А. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974. С. 101, 109; Бел. пісьменнікі. Т. 2. Мн., 1993. С. 423; Ельскі, А. Выбранае. Мн., 2004. С. 482. |
| **Кракаў** | Кафедра археалогіі Ягелонскага універсітэта | | Старонкі літаратурных сувязей. Мн., 1970. С. 161. |
| **Кракаў** | Нацыянальны музей | | Старонкі літаратурных сувязей. Мн., 1970. С. 161; Мальдзіс, А. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974. С. 107. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| **Радам** | Сямейны архіў Анжэя Ельскага | | Шляхам гадоў. Мн., 1993. С. 140–148; Дзеля блізкіх і прышласці. Мн., 1999. С. 49–50. |
| | | **ЛІТВА** | |
| **Вільня** | Бібліятэка Акадэміі навук Літвы | Рук. ф. 7, адз. зах. 661; ф. 9, адз. зах. 2367; ф. 151, адз. зах. 203, 1021; ф. 273, адз. зах. 1133 | Кісялёў, Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча. Мн., 1993. С. 115, 337–338; Бел. пісьменнікі. Т. 2. Мн., 1993. С. 423. |
| **Вільня** | Цэнтральны гістарычны архіў Літвы | Ф. 378, аг. аддз., 1860 г., спр.1084; ф. 1135, воп. 10, спр. 87, л. 275–278, спр. 97, л. 426–470, спр. 116; воп. 11, спр. 4, л. 71; воп. 20, спр. 192–200, 295, 515; воп. 21, спр. 63, 64, л. 22–28, 383–390; воп. 22, спр. 20 | Кісялёў, Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча. Мн., 1993. С. 78, 115, 270, 338; Бел. пісьменнікі. Т. 2. Мн., 1993. С. 423; Ельскі А. Выбранае. Мн., 2004. С. 482. |
| | | **УКРАІНА** | |
| **Кіеў** | Цэнтральны гістарычны архіў Украіны | Ф. 262, воп. 1, спр. 151, 153 | Дзеля блізкіх і прышласці. Мн., 1999. С. 62–63, 68; Кісялёў, Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча. Мн., 1993. С. 335, 381; Рагойша, В. Невядомы пераклад // Літ. і мастацтва. 1979. 2 лют.; Бел. пісьменнікі. Т. 2. Мн., |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| | | | 1993. С. 423. |
| **Львоў** | Бібліятэка Акадэміі навук Украіны | Ф. Карловіча, адз. зах. 2 | Бел. пісьменнікі. Мн., 1993. Т. 2. С. 423. |
| **Львоў** | Цэнтральны гістарычны архіў Украіны | Ф. 201, воп. 4, спр. 3390; воп. 4в, спр. 313 | Мальдзіс, А. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974. С. 11; Кісялёў, Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча. Мн., 1993. С. 381; Бел. пісьменнікі. Т. 2. Мн., 1993. С. 423. |
| **БЕЛАРУСЬ** | | | |
| **Мінск** | Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва | Ф. 43, воп. 1, спр. 1–30; ф. 66, воп. 1, спр. 550 | Кісялёў, Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча. Мн., 1993. С. 78; Бел. пісьменнікі. Т. 2. Мн., 1993. С. 423. |
| **Мінск** | Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі | Ф. 295, воп. 1, спр. 3023, 4382; ф. 319, воп. 2, спр. 5, арк. 104–105 | Дзеля блізкіх і прышласці. Мн., 1999. С. 54; Бел. пісьменнікі. Т. 2. Мн., 1993. С. 423. |
| **Мінск** | Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАНБ | Пісьмы Я. Карловічу Фр 26 (м/ф) | |
| **РАСІЯ** | | | |
| **Масква** | Цэнтральны архіў літаратуры і мастацтва | | Кісялёў, Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча. Мн., 1993. С. 78. |
| **С.-Пецярбург** | Інстытут рускай літаратуры АНР (Пушкінскі дом) | Рукапісны аддзел | БДАМЛіМ. Ф. 66, воп. 1, спр. 550; Кісялёў, Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча. Мн., 1993. С. 380. |
| **ВАТЫКАН** | | | |
| **Рым** | Архіў Ватыкана | | Мальдзіс, А. Рымскі дзённік // Беларусь. 1991. № 2. С. 14. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ